№ 8 (37) Пятніца, 18-га сакавіка 1927 г. м. Вільня Год II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз ... Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адраджэ... ...торыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмократызм.—Барацьба ... ...мунізмам.—Нацыянальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл.
„ „ „ 3 „ 2 зл.
Заграніцу ўдвая даражэй.

...эс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul.Ludwisarska 5 m. 2.
...акцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—10 гр.
за радок нонпарэля.

MEMENTO...

Што Польшча маладая дзяржава, у гэтым няма спрэчкі. Але напэўна нідзе ў цэлым сьвеце гэткай лічбы недальнавідных палітыкаў, як у Польшчы няма. Асабліва калі мова ідзе аб г. зв. крэсавым пытаньні. Тут ёсьць цэлыя масы rzeczoznawców, краёўцаў, крэсоўцаў і г. д. і г. д. Але вось ужо колькі гадоў як усе занятыя справамі крэсаў, а на гэтых крэсах усё горш і горш.

Прэса заўседы ёсьць выразіцелям думак пэўных групаў. Дык каб даказаць праўдзівасьць сваей думкі аб блізказоркасьці усіх крэсавых групаў, прагледзім іх адносіны, паводле асьвятленьня іх прэсы да Грамады. Немагчымыя адміністрацыйныя адносіны, удушлівая крэсовая атмосфэра, адсутнасьць рэформаў, а ў дадатак агульна дзяржаўны гаспадарчы крызіс, усё гэтае была прагледжана ўсімі крэсовымі групамі. Яны *не заўважылі*, як вытварылася гэткая атмосфэра, на якой гэтак жа *не заўважана* і раптоўна паўстала 90 тысячная антыдзяржаўна комуністычная Грамада. Польская прэса раптам яе ўбачыла, і падняла алярм Ня была дню, каб на шпальтах крэсовых газэтаў не абгаварвалася справа „гурткоў“, якія зрабіліся крэсовым жупелам. Усе газэты лемэнтавалі, але ніхто не падаваў конкрэтных выхадаў. Частка газэтаў, галоўным чынам правых, прапанавала — стары спрабаваны сродак выключна рэпрэсыўных мераў, другая частка альбо лоўка абыходзіла агульнымі фразамі найбольш балючыя пытаньні, альбо вітала ў ваблаках — ў планетарных плянах *Вялікай Літвы* і г. д. А Грамада расла і расла. Дэмаралізуючая зараза распаўсюджывалася па ўсей Заходняй Беларусі. Лямэнт польскай прэсы павялічваўся, але зноў такі ня была чутна здаровага голасу аб спосабах фактычнага аздараўленьня крэсаў. Дарэмна беларуская дэмакратычная прэса розных напрамкаў у адзін голас крычэла, што галоўнай прычынай росту незадаваленьня насяленьня ёсьць адсутнасьць рэформаў і паправы пры немагчыма цяжкіх сучасных варунках крэсовага жыцьця. Потым прыйшлі рэпрэсіі. Газэты польскія ў адзін голас падалі сэнсацыю аб ліквідацыі Грамады. Потым аб ліквідацыі сталі гаварыць менш, а пачалі пісаць аб *„самаліквідацыі“*, што грамадаўцы „варочаюць„ свае партыйныя білеты старостам і амаль не паліцыі!

І вось раптам зноў у нумары за 15 сакавіка „Dz. Wileński“ зноў ударыў у набат, замясьціўшы артыкул пад назвай „Грамада аджыла“. Мы пэўны, што ўсьлед за „Dz. Wil.“ будуць крычэць і іншыя крэсовыя газэты.

І ізноў пачнецца байка пра белага бычка. Мы-жа казалі і кажам, што Грамада паўстала выключна як хвароба на хворым крэсавым грунце. Пакуль грунт гэты не здаровы — хвароба не будзе вылечана. Праўда Грамада перажывае цяпер крызіс. У многіх раёнах, *гдзе інтэнсыўна працавалі іншыя беларускія групы*, грамадаўскія гурткі альбо зусім паразвальваліся, альбо іх надта стала мала і яны нячынныя. Але настроі, *атмасфэра — не зьмянілася*, бо не зьмяніліся варункі жыцьця, бо *не ідуць рэформы*. Мы скажам яшчэ больш ясна. Калі-б Грамада сябе не скампрамітавала сваім басяцка-комсамольскім і крымінальным элемэнтам, а асабліва сваей *выразна* комуністычнай праграмай і залежнасьцю ад бальшавікоў, дык яна застаючыся арганізацыяй яскрава антыдзяржаўнай, была бы да сяньняшняга дню магутнай. Бо Дзяржава сама нядбала аб тым, каб тую атмасфэру, на якой вырастаюць атручаныя кветкі „грамадаўшчыны“ ачысьціць.

Той факт, што самы моцны ўдар Грамадзе нанясла Бел. Нац. Рада і іншыя нацыянальныя групы, як арганізацыі праўдзіва нацыянальныя і антыбальшавіцкія, ясна гаворыць якімі сродкамі можна зьліквідаваць Грамаду. Усе дзяржаўна думаючыя людзі павінны былі бы даўно зразумець, што выключна беларускім нацыянальным групам, лёяльным у адносінах да Дзяржавы дадзена скіраваць беларускі народ на правідловы шлях парадку і палепшаньня жыцьця.

Дык няма чаго зноў алярмаваць. Трэба лячыць не пасьледзтва хваробы, а самую хваробу. Гаворачы гэта ўжо ня ў першы раз мы адначасова падкрэсьляем, што для зразуменьня гэтага найвялікшы час. Ідуць мамэнты надта важныя для Дзяржавы. Што б ні-было, якую-б уставу самаўрадовую, ці малую, ці вялікую, ці дэмакратычную ці куртатую ўхваліць Сойм, але *выбары* да самаўрадаў *прыйдуць*, ня прысьці яны ніяк не могуць. Дык тагды *пры выбарах*, не памогуць ужо ніякія прэсыі, не ўратуе ніякі лямэнт. А там ужо не за гарамі выбары ў наступны Сойм Там справа можа быць яшчэ гарэй. Дзяржаўная ўлада стаіць перад мамэнтам *небясьпечнага* экзамену. Калі яна гэты экзамен не вытрымае, дык крэсовыя самаўрады, і крэсовае соймавае — прадстаўніцтвы акажуцца шмат горшым, як сяньняшняе, і будзе скандал і канфуз на ўсю Эўропу, што ня можа не адбіцца на вонкавым прэсьціжу і сіле Дзяржавы.

Што датычыць унутранага значэньня рэзультатаў гэткіх выбараў, дык гэткія рэзультаты з комуністычна-грамадаўскімі самаўрадамі і пасламі на Сойм аканчальна згусьцілі-б атмасфэру і зрабілі-бы абсолютна немагчымай уселякую творчую працу на крэсах.

ПРАТЭСТУЕМ!

Газэты падалі вестку аб звальненьні з Беларускай Гімназіі ў Вільні адразу 5 настаўнікаў, п.п. Заморына, Савіцкага, Паўловіча, Міхалевіча і Сіняўскага, а роўным чынам трох пэдагогаў з Беларускай Гімназіі ў Радашковічах. Газэты падаюць, што быццам прычынай звальненьня зьяўляецца „палітычная неблагонадзёжнасьць“ гэтых пэдагогаў. Праўда, нажаль адзін сярод іх, ласьне пан Савіцкі, ёсьць старшынёю вядомага „Белкому“, што відаць і было галоўнаю прычынай дамяшаць да няўдалай і шкадлівай антэрпрызы п. Савіцкага, беларускага культурніка, у выразнай і актыўнай экспазытуры Грамады, якой зьяўляецца Бел. Нац. Камітэт. Аднак-жа ў імя праўды мусім зазначыць, што п. Савіцкі фактычна быў толькі намінальным старшынёю гэтага камітэту, фактычным кіраўніком якога зьяўляецца вядомы А. Луцкевіч.

Што датычыцца іншых звольненых пэдагогаў, дык яны палітычна зусім не ангажаваліся. З прычыны вышэй паданага Т-ва „Прасьвета“, якое стаіць у абароне беларускае культуры і працаўнікоў на беларускім культурным полі, і адначасова адкрыта змагаецца з комуністамі і дэмаралізуючымі ўплывамі на нашую моладзь, усіх тых чыньнікаў, якія з беларускіх культурных установаў прабуюць зрабіць аружжа для сваіх палітычных мэтаў, — пратэстуе проці масовага звальненьня кваліфікаваных апалітычных беларускіх пэдагогаў. Гэтае звальненьне кладзе прыкры прэцэндэнт расправы за грахі палітычных праступнікаў з беларускімі культурнікамі. Зьвяртаем увагу сучаснага дэмакратычнага ўраду Польшчы на гэтую несправядлівасьць і крыўду з боку віленскага Куратарыума ў адносінах да беларускіх культурнікаў і падкрэсьляем, што нават комуністычная ўлада ў Менску не мае адвагі падымаць руку на беларускую культуру. Дзеля гэтага Т-ва „Прасьвета“ лічыць пэўным, што ўрад скасуе гэтае несправядлівае распараджэньне.

Урад Т-ва „Прасьвета“.

Палітычны агляд.

7 сакавіка пачалася ў Жэнэве чарговая сэсія рады Лігі Народаў у новым складзе сяброў, сярод якіх першы раз выступілі між іншымі і прадстаўнікі Нямеччыны і Польшчы. У апошні час стварыўся звычай, што падчас жэнэўскага зьезда сяброў Лігі Народаў вырашаюцца паважнейшыя міжнародныя справы за кулісамі афіцыяльных паседжаньняў. Гэтак выйшла на яву Туары, нямецка-італьянскае збліжэньне і іншыя. Дзеля гэтага і на гэты раз зьвярталася агульная ўвага ня столькі на афіцыяльную праграму сэсіі Лігі, сколькі на прыватныя спатканьні і канфэрэнцыі міністраў загранічных справаў эўрапэйскіх дзяржаваў, галоўным чынам Штрэзэмана, Залескага, Брыяна і Чэмбэрлена. І надзеі гэныя спраўдзіліся.

Перш-на-перш трэба адмеціць карысныя вынікі канфэрэнцыі Штрэзэмана з міністрам Залескім пад націскам Чэмбэрлена і Брыяна. Наагул з першых дзён сэсіі Рады Лігі ў Жэнэве запанавала мірная атмасфэра. Штрэзэман і Залескі адразу дайшлі да згоды па ўсім закранутым пытаньням. Праўда не дасягнута яшчэ аканчальнага рашэньня з поваду складанасьці і труднасьці праблемы польска-нямецкіх адносінаў, але намечаны галоўныя шляхі ўладжаньня істнуючага канфлікта і вызначаны тэрмін аднаўленьня перарваных гандлёвых перагавораў, у часе якіх і будуць вырашаны ўсе спрэчнасьці

Уступчывасьць і лагоднасьць міністра Штрэзэмана належыць прыпісаць некарыснай для Нямеччыны палітычнай кан'юнктуры ў зьвязку з яе нявыразнай паставай ў адносінах да Радавай Расеі, проці якой у цэлай Заходняй Эўропе запанавала агульнае незадаваленьне. Намеціўшаяся магчымасьць англійска-польскага збліжэньня з аднаго боку і погоршаньне адносінаў з Францыяй і Бэльгіяй з другога падзеялі абразумляюча на Нямеччыну, якая пачула небясьпечным для сябе далей заставацца ў двулікай ролі. У зьвязку з рашучай акцыяй Англіі проці Масквы пачалося рэзкае размежаваньне між праціўнікамі і прыхільнікамі апошняй, і Нямеччына мусіла выразна далучыцца да таго ці іншага кірунку. Пробным каменям гэтага былі польска-нямецкія адносіны, ў якіх немцы і рашылі ўступіць на шлях аб'еднаньня.

Зьмена палітычнага кірунку Нямеччыны знаходзіцца ў гармоніі з паважнай пераменай палітычнай арыентацыі Італіі адносна Радавай Расеі. Да апошняга часу Італія пасьля Нямеччыны лічылася найбольшай прыхільніцай Масквы сярод усіх заходня-эўрапэйскіх дзяржаваў. Дзеля гэтага яе пераход на бок антыбальшавіцкага блёка пад кіраўніцтвам Англіі давёў бальшавікоў да шаленства. Гэты пераход выразіўся ў прызнаньні Італіяй Бэсарабскай граніцы Румыніі.

Адносная канвэнцыя аб Усходняй Бэсарабскай граніцы Румыніі ад 1920 г. вымагала для санкцыі яе прызнаньня хоць трымя дзяржавамі з чатырох падпісаўшых яе, г. ё. Францыі Англіі, Італіі і Японіі. Францыя і Англія ўжо раней прызналі Бэсарабскую граніцу, з-за якой увесь час йшла спрэчка між бальшавікамі і Румыніяй. Італія-ж, знаходзячыся у добрых адносінах з бальшавікамі, увесь час адкладала гэтае пытаньне. А Японія проста заяўляе, што яна не зацікаўлена ў эурапэйскіх пытаньнях і ня хоча зьвязваць імі сваіх рук Гэткім чынам пытаньне аб Бэсарабскай граніцы ўвесь час заставалася адкрытым. Але актыўнае выступленьне Італіі на Балканах і ў сярэдняй Эўропе ў зьвязку з аналёгічнай акцыяй Англіі проці бальшавікоў прымусілі Муссаліні выйсьці з пазыцыі вычаканьня ў бэсарабскім пытаньні. Нядаўна між Румыніяй і Італіяй быў падпісаны дагавор дружбы, зрабіўшы моцнае ўражаньне на сяброў Малай Антанты і бальшавікоў, а цяпер Італія прызнала Бэсарабскую граніцу Румыніі. Гэткім чынам румынская граніца з Радавай Расеяй атрымала міжнароднае прызнаньне і ад гэтага часу бальшавікі ў выпадку збройнага нападу на Румынію прымушаны будуць лічыцца з вялікімі дзяржавамі і Лігай Народаў, як стоячай на грунце пашаны істнуючых граніц і палажэньня, створанага міжнароднымі трактатамі. Гэты акт можна параўняць з прызнаньнем Польскай усходняй граніцы вялікімі дзяржавамі ў 1923 г. У Букарэшце па гэтаму поваду адбываюцца вялікія ўрачыстасьці, а ў Маскве выбух шаленства і бязплоднай ненавісьці проці Італіі і Англіі, якая лічыцца віноўніцай усяго гэтага. Гэткім чынам Англія дасягнула сваей мэты — прымусіла бальшавікоў зьвярнуць большую ўвагу на сваю заходнюю граніцу, што мусіць адбіцца на актыўнасьці бальшавіцкай акцыі ў Азіі і ў прыватнасьці ў Кітае. Далучэньне Італіі да антыбальшавіцкага блёка і прызнаньне Бэсарабскай граніцы вялікімі дзяржавамі заканчывае той мур, які аддзяляе бальшавікоў ад Заходняй Эўропы Дзякуючы гэтаму ўзмацняецца і польска-румынскі хаўрус, як роўна і ўплыў Францыі ў гэтых краях. Цяпер за сьпіною Польшчы і Румыніі стаіць сьцяною ўся Заходняя Эўропа, апрача Нямеччыны, якая, як мы нядаўна бачылі, гэтак сама паволі далучаецца да антыбальшавіцкага блёку.

Але і бальшавікі не засталіся ў доўгу. Для іх вельмі важна было, каб якой бы гэта ні было цаною разарваць зьвязываючыйся навокала іх жалезны пярсьцёнак з дзяржаваў, баронячых культуру проці бальшавіцкага барбарызму. І яны, трэба прызнаць іх спрыт, дасягнулі гэтай мэты. Апрача гарантыйнага пакту з Літвою бальшавікі на днях падпісалі зусім аналёгічны дагавор з Латвіяй. Сэнс гэтага дагавору заключаецца ў тым, што ў выпадку збройнай спатычкі аднэй з дагаворных старон з трэцяй, другая мусіць падтрымліваць нэйтралітэт. Апрача таго ні адна з дагаварыўшыхся старон ня мае права ўступаць ў якую-небудзь коаліцыю скірованую проці другой стараны. Далей мусяць быць акрэсьляны адносіны Латвіі да Лігі Народаў. Гэткім чынам Латвія падобна Літве ня можа пашкодзіць С.С.Р.Р. у выпадку вайны. Гэтую дзіру ў заходнім муру маскоўская дыплёматыя мае замер пашырыць яшчэ на Эстонію, з якой ўжо вядуцца перагаворы і на Фінляндыю. Зусім магыма, што ім пашанцуе дзеля таго, што лёс гэтых малых рэспублік моцна залежыць ад Масквы. Гэта яскрава выразілі нядаўна ў сваіх прамовах як літоўскі прэм'ер Вальдэмарас, гэтак сама і латвійскі міністар загранічных справаў. Першы зазначыў, што літоўская палітыка ня можа быць ні філарадавай ні філа-англійскай, ні філа-нямецкай, а толькі літоўскай. А другі з поваду заключэньня пакта аб непападаньні заявіў, што гарантыяй незалежнасьці Латвіі зьяўляецца толькі мірная палітыка ў адносінах яе суседзяў Гэта значыць, што як Літва, гэтак сама і Латвія ня хочуць прыймаць ніякага вучасьця ў якіх небудзь блёках, скіраваных проці якой небудзь дзяржавы. Вальдэмарс хацеў бы, каб Літва была нэйтральнай дзяржавай кшталтам Швэйцарыі. Прыблізна гэтакую-ж канцэпцыю высунуў і латвійскі міністар Цэленс, прапануючы, каб Літва, Латвія, Эстонія і Фінляндыя з аднаго боку і Нямеччына, Англія, Францыя і Радавая Расея з другога заключылі агульны гарантыйны пакт. Гэта сьведчыць аб тым, што прыбалтыцкія рэспублікі не пераацэніваюць сваіх сіл і магчымасьцяў. Што можа пазволіць сабе Польшча ці нават Румынія, таго ня могуць пазволіць сабе Літва, ці Латвія. Бальшавікі, забясьпечаныя з боку Літвы, Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі, могуць зьвярнуць большую ўвагу на Польска-Румынскую граніцу на выпадак аружнага канфлікту. Гэтым больш як напалову зьменшаецца агульны антыбальшавіцкі фронт на Захадзе.

N.

Апошнія навіны.

У Польшчы.

ЗАБАСТОЎКА ў ЛОДЗІ. У Лодзі распачалася забастоўка работнікаў мануфактурных фабрык, якія дамагаюцца павышэньня заработнай платы. Усе фабрыкі ў Лодзі спынілі працу. Кіруюць забастоўкай П. П. С. (польская сацыялістычная партыя) і Н. П. Р. (нацыянальная работніцкая партыя). Усяго забаставала 100.000 работнікаў.

З Варшавы выезджаюць да Лодзі прадстаўнікі ўраду, каб на мейсцы пазнаёміцца з палажэньнем і прыняць адпаведныя крокі к ліквідацыі забастоўкі.

НЕПАРАДКІ ў ЖЫХЛІНЕ. У м. Жыхліне Лодзкага ваяводзтва нейкі Краска на-

Падзеі у Кітаі.



На фатаграфіі бачым малы аддзел кантонскіх жаўнераў.

Водгукі Зьезду Заходняй Беларусі.

Пісьмо Яго Высокапрэасьвяшчэнства Мітрапаліта Дзяніса да Старшыні Беларускай Нацыянальнай Рады, б. Старшыні Зьезду Заходняй Беларусі ў 1926 г. п. Паўлюкевіча.

Прадстаўленыя Вамі ў леташнім годзе рэзалюцыі па рэлігійным пытаньням Беларускага Зьезду, які адбыўся ў чэрвені 1926 годзу былі, згодна пастановы Сьв. Сыноду ад 11 лістапада 192 г., перасланы на одзыў усім Епархіяльным Прэасьвяшчэнным, у Епархіях якіх жыве ў значнай колькасьці беларускае насяленьне.

Прымаючы пад увагу, што азначэньнямі Сьв. Сыноду ад 14 сьнежня 192 г. дадзены ўказаньні аб поўнай магчымасьці беларусізацыі багаслужэньня, дзе гэта ўкажацца магчымым і пажаданым, а такжа, што апрача Пасхальнага Эвангельля на беларускай мове німа зусім кнігаў для багаслужэньня, а магчыма толькі казаньне на беларускай мове, — Сьвяшчэнны Сынод на паседжаньні 25 лютага с. г. пастанавіў: 1) прыняць рэзалюцыі па рэлігійным пытаньням Беларускага Зьезду да ведама і 2) *бог славіць сьвяшчэньнікаў—беларусаў з любоўю аднесьціся да царкоўнага казаньня на роднай для іх і іх народа беларускай мове* там, дзе народ гэтага пажадае.

Аб гэтым лічу патрэбным паведаміць Вас для азнаямленьня п. п. сябраў Зьезду.

Дзяніс

Мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы.


Варшава, 8. III. 1927 г.

паў на стоячага на пасту паліцыянта. Той баронячыся ўжыў рэвальвэр, прычым раніў Краску. Сабраўся вялікі натоўп людзей, які хацеў расправіцца з паліцыянтам. Прыбыўшая ў час паліцыя натоўп разагнала, арыштаваўшы больш 10 чалавек.

ПАСЬВЯЧЭНЬНЕ ШТАНДАРУ ЎКРАІНСКАГА СТУДЭНСТВА. У суботу 12 сакавіка ў Варшаўскім саборы адбылося ўрачыстае пасьвячэньне штандару ўкраінскага студэнства.

КАНФЭРЭНЦЫЯ Ў СПРАВЕ ЎСХОДНІХ ВАЯВОДЗТВАЎ. 12 сакавіка ў міністэрстве Унутраных Справаў адбылася канфэрэнцыя з удзелам міністра ўнутраных справаў і пяці ўсходніх ваяводаў: віленскага, беластоцкага, навагрaдзкага, валынскага і палескага. На канфэрэнцыі быў прысутны віцэпрэм'ер Бартэль.

Заступнік Чычэрына.



У сувязі з падзеямі ў Кітаі англійскі ўрад выслаў да ўраду С.С.Р.Р. пагражаючую ноту. Аўтарам адказу на англійскую ноту заяўляецца Літвінаў (Фінкельштэйн) заступнік Чычэрына.

Мэтай канфэрэнцыі было паінфармаваньне цэнтральнае ўлады аб сучасным стане адміністрацыі ўсходніх ваяводзтваў, а роўна і палажэньні палітычным і гаспадарчым у гэтых ваяводзтвах. Асаблівая ўвага была зьвернута на справы адміністрацыйныя, палітычныя і стан бясьпечнасьці. Спэцыяльна разглядаліся справы, вынікаючыя з найважнейшых патрэбаў насяленьня ўсходніх ваяводзтваў, як акцыя адбудовы і іншыя.

ТАМАШ МАНН Ў ВАРШАВЕ. 9 сакавіка прыехаў на запрашэньне польскага літэратурнага клюбу да Варшавы знамяніты нямецкі пісьменьнік Тамаш Манн. Было яму зроблена ўрачыстае спатканьне.

15 ГЭНЭРАЛАЎ ІДЗЕ Ў АДСТАЎКУ. Прэзыдэнт Рэспублікі падпісаў дэкрэт звальняючы з вайсковае службы 15 гэнэралаў.

ЗАЯВА НЕДАВЕРРА ДЛЯ ПРЭЗЫДЫУМА ЎКРАІНСКАГА КЛЮБУ. На паседжаньні Украінскае парлямэнтарнае рэпрэзэнтацыі, што адбылася 9 сакавіка — дагэтуляшняму прэзыдыуму рэпрэзэнтацыі выказана недаверра. Як ведама да прэзыдыуму ўваходзілі сельробы (кшталтам нашых грамадаўцаў) Казіцкі і Чучмай. Большасьць паслоў і сэнатараў не згадзілася з сельробаўскаю палітыкаю і прымусіла іх адмовіцца ад павадырства клюбам. Выбары новага прэзыдыму адбудуцца 20 сакавіка, а пакуль што на чале клюбу стаіць найстарэйшы векам сэнатар Герштанскі.

За граніцай.

ПАДРОБНАСЬЦІ ЗЯМЛЯТРАСЕНЬНЯ Ў ЯПОНІІ. Японскае пасольства атрымала гэткія даныя аб астатняй катастрофе трасеньня зямлі: Вогнішча трасеньня знаходзілася на поўнач ад даўнейшае сталіцы Японіі Кіото. Колькасьць зьнішчаных пажарамі і зруйнаваных дамоў ў паасобных мястэчках вельмі вялікая. Людзей згінула падчас катастрофы 1,100 асоб.

РАСЕЙСКІ БЕЛЫ АТРАД У КІТАІ. У рукі белага расейскага атрада, на чале якога стаіць гэн. Нечаеў папаўся на рацэ Ян-Тсэ савецкі параход. На параходзе знаходзілася некалькі савецкіх агітатараў і жонка савецкага пасла ў Кантоне Барадзіна. Усе заарыштаваны.

Гэтая справа нарабіла вельмі шмат шуму. Савецкі ўрад выслаў да Пэкіну спэцыяльную ноту. Але арыштаваных дагэтуль яшчэ ня звольнілі.

СПРАВА ЭСТОНСКАГА ПАСЛА БІРКА. Некалькі месяцаў таму назад эстонскі пасол у Маскве Бірк — зрабіўся прыхільнікам бальшавікоў і здрадзіў Эстоніі. Бірк перадаў савецкай уладзе шмат дакумэнтаў пасольства.

Цяпер надыйшла вестка, што Бірк уцёк з С. С. Р. Р. і затрыманны на эстонской граніцы. Арыштаваны Бірк заявіў, што Г.П.У. выкарыстаўшы і выцягнуўшы ад яго ўсё, што ён толькі ведаў, пачало яго перасьледаваць. Ён знаходзіўся як-бы пад хатнім арыштам. Ня выцярпеўшы гэткага жыцьця Бірк уцёк з паваротам на бацькаўшчыну.

АНГЛІЙСКА - НЯМЕЦКАЕ ПАРАЗУМЕНЬНЕ. Французскія газэты падаюць, што ў часе размовы са Штрэзэманам, нямецкім міністрам заграцічных справаў Чэмбэрлен сказаў, што Англія ёсьць склоннай да пэўных уступак у справе звароту некаторых калёніяў Нямеччыне, калі толькі Нямеччына дапаможа ёй у канфлікце з С.С.Р.Р. і Кітаем.

ПРЫЗНАНЬНЕ БЭСАРАБІІ ЗА РУМЫНІЯЙ. Найбольш значнай падзеяй у апошні час зьяўляецца заява італьянскага дэлегата ў Лізе Народаў, што італьянскі ўрад ратыфікаваў дагавор, які быў заключаны 20 кастрычніка 1920 году паміж Румыніяй з аднаго боку і Францыяй, Англіяй, Італіяй і Японіяй з другога — адносна Бэсарабіі.

Пасьля ратыфікацыі дагавору Італіяй — атрымаў ён поўную сілу.

ЗАМАХ НА РЭДАКЦЫЮ Ў ЛІТВЕ. 11 сакавіка ў Коўні быў зроблены замах на рэдакцыю і друкарню газэты „Летувос Жыніос". Няведамыя замахоўцы падкінулі бомбу да рэдакцыі памянёнае газэты.

Друкарская машына з іншымі друкарскімі прыладамі зьнішчаны зусім. Моцна пацярпела і памешканьне рэдакцыі. Усяго былі два выбухі. Газэты цьвердзяць, што замах мае палітычны характар. Паліцыя вядзе сьледзтва, але вынікаў пакуль што німа.

ПАРАЗУМЕНЬНЕ САЦЫЯЛІСТАЎ РАСЕЙСКІХ і УКРАІНСКІХ У ПРАЗЕ ЧЭСКАЙ. Агенства „Русспрэсс" падае: У Празе Чэскай адбылася канфэрэнцыя расейскай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянэраў і ўкраінскіх партый сацыял-дэмакратычнай і сацыял-рэвалюцыйнай. Расейскіх эсэраў працстаўляў б. прэзэс расейскага „Учредит. Сабранія" Чэрнов. Украінцаў — Шапавал і Грыгор'еў. У выніку канфэрэнцыі падпісаны акт паразуменьня, на моцы якога ўсе тры памянёныя партыі забавязаліся весьці супольную акцыю процi істнуючай у Расеі Савецкай улады. Блёк гэтых партый атрымаў назву: „Сувязь вольных народаў усходняй Эўропы".

СЬМЕРЦЬ ПРЭЗЫДЭНТА ЛАТВІІ. Пасьля доўгай і цяжкай хваробы памёр прэзыдэнт латвійскае рэспублікі Чакстэ.

АРЫГІНАЛЬНЫ СПОСАБ БАРАЦЬБЫ З КОМУНІСТАМІ. Чылійскі ўрад (Амэрыка) рашыў выслаць усіх арыштаваных комуністаў на востраў Мас а Фэра ў Ціхім акіяне. Высыланым комуністам дазволена забраць свае сем'і. Будзе ім дадзены будаўляны матэр'ял і жывёла. На востраве багатая расьціннасьць, каля берагоў добрыя рыбныя промыслы. Для нагляду за высыланымі, разам з імі адпраўляецца атрад паліцыі.

КАНЕЦ СЭСІІ РАДЫ ЛІГІ НАРОДАЎ. У суботу адбылося астатняе паседжаньне Рады Лігі Народаў. Хаця падчас нарадаў дайшло да канфлікту паміж Нямеччынай і Францыяй у справе звальненьня вобласьці Сары, усё-ж у гэтай справе дайшло да паразуменьня.

Рада Саюзу Народаў прыняла адвагалосна прапазыцыю міжнароднай камісіі для сарскай вобласьці. Далей прынята пастанова, што звальненьне сарскай вобласьці ад акупацыйнага войска наступіць найдалей за тры месяцы.

Пасьля прыняцьця гэтых пастановаў Рада выбрала новых сябраў міжнароднай камісіі для загаду сарскай вобласьцю.

Падзеі у Латвіі.

У сувязі з падпісаньнем савецка латвійскага дагавору і сьмерцяй прэзыдэнта Латвіі Чакстэ—сытуацыя стэлася вельмі напружаней.

Справа ў тым, што як публічная опінія, гэтак і большасьць палітычных партый варожа настроены да ўраду Цэленса, які падпісаў дагавор з Саветамі.

Наагул сацыял-дэмакратычны ўрад выклікае вялікае незадаваленьне ў краі.

Фашыстаўска-нацыяналістычныя арганізацыі ўважаюць сучасны мамэнт за найлепшы да аружнага выступленьня. Асабліва прычыняецца да гэтага сьмерць прэзыдэнта, які карыстаўся даволі вялікай папулярнасьцю.

Адзін з выдатнейшых латвійскіх палітыкаў выразіўся, што калі-б сацыял дэмакратычны ўрад і надалей трымаў-бы ўладу ў сваіх руках, дык можна чакаць найдалей ідучых камплікацый у краі.

Тымчасам правыя партыі ўнясьлі да Сойму інтэрпэляцыю ў справе латвійска савецкага дагавору.

Можна чакаць, што калі цяперашні ўрад сам не падасца ў адстаўку—дык будзе скінуты сілай.

У С. С. Р. Р.

Працэс антысавецкіх партызан.

У Бабруйскім савецкім акружным судзе слухаецца справа сябраў партызанскага атраду атамана Міхала Бакуна, працуючага амаль два гады процiў бальшавікоў на тэрыторыі Савецкай Беларусі. На лаўцы падсудных 49 чалавек, з каторых толькі 8 належала безпасрэдна да атраду Бакуна, а рэшта дапамагалі атраду. У ліку партызанаў—адна кабета, Аўдакія Дудаль, прымаўшая ўдзел у апэрацыях атраду. Сам Бакун быў злоўлены бальшавікамі ў канцы 1926 году і расстрэляны.

Атрад Бакуна арганізаваўся ў канцы 1924 году і выпаўніў да канца 1926 году, калі быў расстрэляны Бакун і яго заменіў Гарашкоў, рад нападаў на савецкія кааперативы, саўхозы, пошту, параходы і на паасобных комуністаў. Атрад дзействаў у Бабруйскім, Магілёўскім, Менскім і Мазырскім акругах.

Перасьледаваньні каталікоў у Расеі.

Менскае Г.П.У. прыступіла да арыштаў сярод каталікоў ў гэтым горадзе. Падчас набажэнства ў менскім касьцеле—будынак быў акружаны атрадам Г.П.У. Агэнты Г.П.У. прымусілі ўсіх выйсьці з касьцёлу і зрабілі вобыск у ўсіх прысутных. Асобы ня маючыя пры сабе дакумэнтаў былі заарыштаваны. Пасьля быў зроблены вобыск у касьцеле і заарыштаваны два ксяндзы.

Інстытут па досьледу хуліганства.

У Петраградзе адчынены аддзел дзяржаўнага інстытуту па досьледу праступнасьці і разьвіўшагася ў апошнія гады хуліганства. Да калегіі інстытуту запрошаны вядомы псыхіатр Бехцероў, якому даручана клініка па досьледу над паасобнымі праступнікамі і хуліганамі.

Ад Адміністрацыі.

Адміністрацыя „Беларускага Слова" зьвяртаецца з просьбай да падпісчыкаў — прыслаць адрасы сваіх знаёмых, каб мы маглі ім выслаць пробныя нумары нашае газэты.

Адміністрацыя.

Літэратурная творчасьць Ядвігіна Ш.

(З нагоды пятых угодкаў ягонай сьмерці: 26—II—22 г.—26—II—27 г.)

Вось ўжо 5 гадоў мінае як адыйшоў ад нас назаўсёды першарадны новэліст беларускі *Ядвігін Ш.*, сапраўднае прозьвішча якога—*Антон Лявіцкі*.

Дзеля таго, што Ядвігін Ш. займае надта-ж выдатнае мейсца ў беларускай прозе, варта пры гэтай нагодзе прыглядзіцца бліжэй да літэратурнай творчасьці і духоўнага аблічча нябошчыка.

У прадмове да ягонай *„Бярозкі"* знаходзім, між іншым, гэткія біаграфічныя даныя аб аўтары *„Васількоў"*: Антон Лявіцкі радзіўся ў 1870 годзе, ў невялікім фальварку сваіх бацькоў, Карпілаўцы, каля мястэчка Радашкавіч, Вялейскага павету.

Хоць тагачасная шляхта ўжо пачала даўно чурацца ўсяго роднага — беларускага і пераймаць польскае — „панскае", Антон Лявіцкі з малых гадоў гадаваўся ў пашане да беларушчыны.

Першай вучыцелькай яго была родная дачка вядомага беларускага песьняра, Вінцука Дунін Марцінкевіча, дык ня дзіва, што патрыятызм апошняга перадаўся і Лявіцкаму.

Скончыўшы гімназію ў пачатку 90-х гадоў папаў у Маскоўскі ўнівэрсытэт. Тут зышоўся з другімі студэнтамі-беларусамі і прыймаў чыннае ўчасьце ў іх працы. Вынікам гэнае працы быў выхад у сьвет беларускае кніжачкі *„Сыгнал"* Гаршына, перакладзенае з расейскае мовы пры ўчасьці Лявіцкага.

Вярнуўшыся дамоў, Лявіцкі пачаў прабаваць пісаць арыгінальныя творы пабеларуску.

У 1893 годзе ён напісаў драму *„Злодзей"*, якую віленскі губэрнатар забараніў паставіць на сцэне толькі затым, што яна была ў беларускай мове. Гэта зьнеахвоціла Лявіцкага настолькі, што ён блізка зусім кінуў пісаць, але калі ў 900-ых гадох узьняўся шырэйшы беларускі рух, калі пачалі выходзіць беларускія газэты, — Лявіцкі ізноў узяўся за пяро і сваімі апавяданьнямі і байкамі выявіў вялікі талент. Асабліва многа ён піша ад 1909 году, перабраўшыся ў Вільню дзеля сталай працы ў *„Нашай Ніве"*.

У тым-жа годзе выходзіць у сьвет і яго вершаванае апавяданьне *„Дзед Завала"* — (1909 г.) — адзіная рэч, напісаная вершам.

А сьледам ідуць зборнікі *„Бярозка"* (1912 г.), ды *„Васількі"* (1914 г.).

Пасьля выхаду *„Васількоў"* Лявіцкі ізноў замаўкае. Прычына гэтага — ваенныя выпадкі, якія прыпынілі выхад *„Нашае Нівы"* і прымусілі Лявіцкага пакінуць Вільню.

І толькі ў 1921 годзе мы бачым яго на віленском грунце ізноў. Але сілы яго ўжо вельмі падупалі, ён вельмі аслабеў, і хоць бярэцца за пяро, ды нічога выдатнага ня творыць.

Апошняя яго кніжачка — гэта *„Успаміны"* з студэнцкага жыцьця, якая выйшла ў сьвет у 1922 г.

Лявіцкі ў тым-жа годзе памёр і пахаваны на магільніку *„Росса"*.

Гэтулькі аб жыцьці аўтара. Цяпер-жа пяройдзем да агляду самае творчасьці Ядвігіна.

Як мы бачылі, Ядвігін прабаваў усіх радоў літэратурнае творчасьці; у кніжках ягоных спаткаем мы драму („Злодзей"), побач з поэзыяй („Дзед Завала"); мэмуары („Успаміны"); новэлы („Бярозка", „Васількі") і нат *повесьць* (ня скончаная *„Золата"*), ня кажучы ўжо аб перакладзе „Сыгнала", але *злюбленай формай яго творчасьці была новэла*.

Зьмест драмы „Злодзей" невядомы, бо самы твор бадай што загінуў; гэтак жа не шмат можна сказаць пра паэмку „Дзед Завала", у якой апісаны стары беларускі дзедпаляўнічы Завала, гэтак зрадніўшыся з пушчай, быццам ён быў яе неад'емленай часткай.

Пачынаецца паэма гэтак:

„Жоўтага пясочку—
„Дый і тога мала :—
Меў наш дзед па бацьку;—
„Зваўся ён Завала.
„Ліхая хацінка
„Саломаю крыта,
„Ліхая адрынка,
„Ды адно карыта
„З крадзенага лесу
„Лава, стол у хаце,
„Міска і дзьве лыжкі —
„Вось, і ўсё багацьце!"

З далейшага зьместу паэмкі відаць, што дзед прыймаў учасьце ў польскім паўстаньні 1863 г., урэшце падчас аднае з сваіх экспэдыцыяў у глыб пушчы Завала гіне.

У паэмцы гэтай ёсьць такжа і даволі прыгожыя малюнкі беларускае прыроды, напрыклад:

„Зашумеў бор цёмны...
„Хто шум той пазнае?
„Чы ветрык павеяў,
„Чы хтось паклікае?..
„Ёсьць у гэтым шуме

ФІНАНСЫ І ГАСПАДАРКА.

Лясны гандаль.

У другой палове лютага адбыўся ў Варшаве зьезд лясных прамыслоўцаў і купцоў з усей Польшчы. Зьезд меў сваёю мэтаю выпрацавець аднальковы плян лепшай эксплёатацыі леса, як роўна зьвярнуцца да Ўраду з постулятамі, каб зьменшыў жалезна-дарожны тарыф і вывазную пошліну на лес і лясныя вырабы, значна пашкодзіўшых лясной прамысловасьці і гандлю, як на ўнутраным, гэтак сама і на заграні̇чным рынку.

Лясны гандаль гуляе вельмі паважную ролю ў агульна-дзяржаўнай гаспадарцы. Але мы будзем разглядаць яго зусім з другога боку: з пункту гледжаньня інтарэсаў сялян, якія не згаджаюцца з асабістымі інтарэсамі лясных прамыслоўцаў, купцоў, уласьнікаў лясных абшараў і часовымі карысьцямі дзяржавы.

Калі экспплёататары лясоў падымаюць голас за аблягчэньне варункаў вывазу леса за граніцу, дык сяляне, асабліва крэсавых абшараў мусяць, ня менш гучны голас падняць у карысьць абароны лясоў, якія бязлітасна нішчацца на нашых вачох. У часе вайны было зьнішчана каля 600,000 будынкаў і 1,000 школаў на беларускіх абшарах. Да гэтай пары яшчэ ня прыступлена к забудове галоўным чынам з-за атсутнасьці лесу і патрэбнай грашовай запамогі з боку самаўраду і дзяржавы. А ў гэты час лясы радзеюць і самае лепшае дзерава цячэ шырокаю ракою заграніцу.

Перш-на перш трэба зазначыць, што ў Польшчы ня так шмат маецца лесу, каб яго можна было так бязлітасна нішчыць. Польшча — гэта не Расея з Сыбір'ю, дзе маюцца дзесяткі мільёнаў дзявічых лясоў, якіх ня зьнішчаць нават бальшавікі пры сваей рабунковай гаспадарцы. І нават на Літве і ў Прыбалтыцкіх рэспубліках адносна больш лесу, чым у Польшчы. У нас лес захаваўся толькі па ўсходніх і заходніх крэсах, у той час як у цэнтры засталіся толькі малыя перлескі. Паводле заявы цяперашняга міністра замельных рэформаў праф. Станевіча немцы ў часе вайны і акупацыі высяклі ў Польшчы лес да кантынгэнту 1934 году. Але гэта ня спыніла далейшай рубкі лесу, якая з кожным годам павялічываецца, як мы гэта пабачым ніжэй.

Паводле афіцыяльных статыстычных даных абшар дзяржаўных лясоў у Польшчы 4 гады таму назад складаў 2,884,677 гэктараў, з чаго на абшар, продукуючы дзерава прыходзіцца 2,524,750 гэктараў. Вартасьць гэтага лесу у канцы 1922 г. дасягала 3,785,485,000 залатых франкоў, а вартасьць гадавой лясной прадукцыі раўнялася 72,451,000 зал. фр. Увесь абшар падзеляны на наступныя лясныя вакругі: Варшаўскі—222,357 гэкт., Радамскі—241,377 г., Седлецкі—334,235, Луцкі—331,694, Белавежскі — 492,999, Віленскі — 400,213, Львоўскі — 309,312, Пазнанскі—219,945, Таруньскі — 320,872 і Горна-Слёнскі — 9,675. Лічба гэта не абнімае лясоў, складаючых прыватную маемасьць.

У Віленшчыне ў 1923 г. рожныя грунты раскладаліся ў наступным парадку: зямля ворная і сенажаці — 987,460 дзесяцін, пашы для скаціны—269,729 дз., лес—409,996 дз., неўжыткі і адлогі—234,018 дз. і вазёры—20,946 дз. Разам—1,922,150 дз. Лес складае 20 прац. агульнага абшару. Віленшчына адносна знаходзіцца у лепшых варунках адносна лесу, чым іншыя крэсы апрача Валыні і Гарадзеншчыны (Белавежская пушча і Аўгустоўскія лясы).

Вартасьць вывазу леса расьце з кожным годам. Гэтак у 1922 г. вывезена за граніцу на агульную суму 86 мільёнаў зл., 1923 г. — 140 міл. зл., 1924 г. — 147 міл. зл., і 1925 г. — 250 мільёнаў зл., складае паволі ад 13 да 20 прац. агульнага польскага экспорту. Але апрача вывазу за граніцу ідзе шмат лесу на унутраны рынак у форме апалу, будаўлянага і абробленага дзерава. Гэтак у 1924 г. на ўнутраны рынак пайшло 3,920,000 т., на экспорт — 1,700,000 тонаў. Але ў 1926 г. як экспорт, гэтак сама і вываз на ўнутраны рынак моцна ўпаў дзеля таго, што жалезна-дарожны тарыф на дзерава быў павялічаны ў два разы. Найлепшыя варункі для ляснога гандлю былі ў 1922—24 г., у часе інфляцыі (спадку) маркі, ў якой быў вылічаны тарыф. З першага студня 1924 г. устабілізавалася валюта і быў значна падвышаны і звалёрызаваны тарыф. Але ўзрост агульна гаспадарчага крызісу выклікала далейшае павялічэньне тарыфа на 30—40 прац. (5 красавіка 1924 г.), 10. VI. 1926 г. быў падвышан на 20 прац., і 1. XII. 1926 г. — на 10 прац.

Па рожным катэгорыям дзерава на ўнутраным рынку складаецца: апаловае—35 пр., неапробленае — 26 прац. і абробленае — 23, прац. Экспортнае: абробленае — 28 прац., папероўка — 28 прац., балкі і шпалы — 19 прац. У 1925 г. на ўнутраны рынак была вывезена: неабробленага — 877,000 т., абробленага 782,000 балак — 133,000 т., капальнякаў — 345,000 т., папероўкі — 142,000 т., і апаловага — 1,160,000 т., разам—3,439,000 т. За граніцу вывезена: неабробленага — 378,000 т., абробленага — 773,000 т., балак — 488,000 т., капальнякоў—269,000 т., папероўкі — 692,000 т., і апаловага — 60,000 т., ці разам 2,660,000 т.

Найбольшы спрос на капальняк у Англіі, Францыі і Бэльгіі для горнай прамысловасьці. На папероўку і шпалы найбольшы спрос у Нямеччыне. На пілаванае дзерава (дошкі) найбольшы спрос у Англіі, які з кожным годам расьце. У 1922 г. экспорт да Англіі гэтага гатунку складаў 16 прац., 1923 г. — 32 прац., 1924 г. — 37 прац., у першай палове 1925 г. — 38 прац. а ў наступны пэрыяд — больш 50 прац. агульнага экспорту пілаванага дзерава Польшчы. Апрача таго даволі вялікі спрос за граніцаю на бандарскія артыкулы (бочкі) асабліва ў тых краях, дзе вырабляецца віно (Францыя). У інтарэсе дзяржавы, каб заграніцу больш экспартавалася абробленага дзерава, што давала бы працу сваім лесапільным заводам і іншым фабрыкам. Дзеля гэтага ўрад значна падняў пошліну на неабробленае дзерава (сыр'ё) — 40 грошаў за кілагр.

Дзякуючы адносна таннай працы работнікаў і дзяржаўнай палітыцы, падтрымліваючай ўсякі экспорт, польскае дзерава можа яшчэ доўга з пасьпехам канкураваць на заграні̇чным рынку і ў будучыне здаецца будзе складаць найважнейшы артыкул экспорта. Лясны гандаль і прамысловасьць далі бы яшчэ большы зыск, калі-б эксплёатацыя вялася больш арганізована і за лесам быў большы дагляд як гэта, напрыклад робіцца ў Нямеччыне. У нас з прычыны адсутнасьці дарог і іншых труднасьцяў каля 50 прац. вырубленага дзерава гніе ў лесе. Наагул у гэтай галіне прамысловасьці пануе найбольшы хаос, заметна адсутнасьць усякай пляновасьці, за што ў будучыне паплаціцца дарагім коштам у першую чаргу народ, а затым і сама дзяржава.

S.

Біржа.

Даляры	8, 94—8, 90 зл.
Залаты рубель	4, 74 зл.
Сярэбраны рубель	2, 70 зл.
Чырвонец	33, — зл.

Збожжа

(*Варшава*)

Жыта (100 кілагр)	42, 50 зл.
Пшаніца „ „	55 — 56 зл.
Ячмень брав	36, 50 зл.
Авёс „ „	37 — 37, 50 зл.

(*Віленшчына*)

Жыта (100 кілагр.)	43 — 44 зл.
Авёс „ „	39 — 40 зл.
Пшаніца „ „	50 — 51 зл.
Ячмень бравaровы	39 — 40 зл.

Найвялікшы аэраплян.

Аэраплян гэты, які можа адначасна перавозіць некалькі дзесяткаў чалавек — курсуе паміж Бэрлінам і Венаю. Каб мець паняцьце аб вялічыні гэтага самалёту трэба зьвярнуць увагу на стоячага каля кола чалавека.



Кідаюць Граамаду і Незалежную Парт. Хл.

Пісьмы у Рэдакцыю.

Паважаны Пане Рэдактар!

Прашу надрукаваць у Вашай паважанай газэце наступнае:

Я—сэкрэтар гуртка Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады ў в. Прытыках Залескае гм. Дзісьненскага павету — Ігнат Андзілеўка гэтым падаю да агульнага ведама, што я адмовіўся ад Грамады ў астатніх днях сьнежня, і такім чынам ужо з месяца лютага ў Грамадзе ня лічуся.

Зрабіў я гэта таму, што Грамада толькі папсавала нашае грамадзкае жыцьцё.

З пашанай
Ігнат Андзілеўка

п. Лужкі, Дзісьненскага пав.—4. III. 1926 г.

Паважаны Пане Рэдактар!

Я жыхар вёскі Паленічыцы, Сталавіцкае гміны Баранавіцкага павету - Кастусь Булыга належаў да Б. С. Р. Грамады. Пераканаўшыся ў тым, што Грамада зьяўляецца арганізацыяй комуністычнай і толькі ашуканствам, абяцаючы ўсякія даброці, уцягвае да сябе беларускае сялянства, — а сапраўды толькі даводзіць да вастрогу,—я ня хачу мець з ёй нічога супольнага і выходжу з яе.

Заклікаю іншых грамадаўцаў, якія жадаюць дабра нашай Бацькаўшчыне—кінуць Грамаду і еднацца каля Беларускай Нацыянальнай Рады, якая сапраўды бароніць нашых правоў.

Кастусь Булыга.

Баранавічы, 8. III. 1927 г.

* * *

Апрача таго беспасрэдна на імя старшыні Беларускай Нацыянальнай Рады паступілі гэткія заявы:

Паважаны Пане Старшыня!

Далучаючы да гэтага білет за N 12,482 *Незалежнай Партыі Хлопскай* — прашу надрукаваць у Вашай паважанай газэце наступнае:

Пераканаўшыся ў тым, што Незалежная Хлопская Партыя ў сапраўднасьці ёсьць партыя комуністычная, якая ашуканствам уцягнула мяне і многіх іншых у свае рады—я нічога супольнага з комунізмам ня маючы, гэтым даводжу да агульнага ведама, што выходжу з ліку сяброў гуртка Н. П. Х. у в. Зьмеўцы Навагрудзкага павету. Заклікаю ўсіх чэсных энпэхоўцаў, якія пераканаліся ў ашуканстве Н.П.Х., на чале якой стаіць пасол Ваявудзкі, які прадаваў беларусаў дэфэнзыве, выступіць з яе і парваць з ёю ўсякую сувязь.

Адначасна прашу Беларускае культурна-прасьветнае Т-ва „Прасьвету" залічыць мяне ў яе сябры.

Зрабіць гэта заклікаю і іншых энпэхоўцаў—*беларусаў*. *Янка* Белуш.

в. Зьмеўка, Навагрудзкага пав.

Паважаны Пане Старшыня!

Прашу надрукаваць у Вашай паважанай газэце наступнае:

Я сэкрэтар гуртка Б. С. Р. Грамады у в. Вензавец, Дзятлаўскае гм. Навагрудзкага пав.—пераканаўшыся ў тым, што Грамада ёсьць партыя комуністычная і антыдзяржаўная, якая ашуканствам уцягнула мяне—выходжу з ліку сяброў гуртка Грамады у в. Вензаўцу, аб чым і даводжу да агульнага ведама.

Заклікаю іншых грамадаўцаў, якія зразумелі ўсё ашуканства Грамады — выпісацца з яе, а еднацца каля нашай Беларускай Нацыянальнай Рады і культурна-прасьветнага Т-ва „Прасьвета".

Партыйны білет Грамады за N 79666 і пасьведчаньне за N 9923 далучаю да гэтага.

Пётра Данільчык.

в. Вензавец, Дзятлаўскае гм. Навагрудзкага пав.

Паважаны Пане Старшыня!

Просім надрукаваць у Вашай паважанай газэце наступнае:

Пераканаўшыся ў тым, што партыя Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада зусім не бароніць нашых сялянскіх інтарэсаў, а толькі імкнецца да рэвалюцыі—мы сяляне вёскі Драбавічы, Казлавецкае гміны Слонімскага павету Язэп Беляўскі і Янка Гародка даводзім да агульнага ведама, што выходзім з ліку сяброў Грамады і заклікаем тое самае

Падзеі у Кітаі.



Атрад арміі, баронючай Шанхай ад Кантонцаў.

„Доля і нядоля,
„Енкі ёсьць, што кажуць,
„Злая дзе няволя...
„Есьць у гэтым шуме
„Плач як-бы сіроткі
„І крык нейкі ціхі,
„Страшны і кароткі..."

Ува ўсім творы чуваць моцны ўплыў на аўтара апісаньняў беларускіх пушч у „Пану Тадэушы", а гэтак-жа паэзыяў Сыракомлі.

Ня будзем тут спыняцца над супольным перакладам „Сыгнала" Гаршына, як слаба зьвязанага з індывідуальнай творчасьцяй Ядвігіна; гэтак-жа мусім мы ўстрымацца ад абгаварываньня няскончанай часьці „Золата", дзеля таго, што яна яшчэ не апублікавана.

Выйшаўшыя лацінкай „Успаміны", зьмяшчаюць у сабе запіскі аўтара з студэнцкіх часоў у Маскве; як жывое вырастае прад намі рэвалюцыйна-паступовае расейскае студэнцтва прадвaенных часоў з усім сваім ідэалізмам, захопленьнем і маладой радасьцяй. Прад нашымі вачыма праходзяць як жывыя: конспіратыўныя кватэры з нелегальнай літэратурай; заядлая барацьба з паліцыяй; удалыя гульні; згаворы; сходкі; арышты; рэвізіі і г. п. Асабліва цікавымі ёсьць мамэнты з прабываньня ў вядомых „Бутырках", якія займаюць большую частку ўспамінаў. Агулам „Успаміны" выклікаюць надта-ж сымпатычнае ўражаньне і шчыра ўзварушваюць чытача, тым больш цэннымі зьяўляюцца гэтыя ўспаміны таму, што „расейскі студэнт" (прадваенных часоў зразумела!) ў значнай ужо меры перайшоў у гісторыю.

А цяпер пяройдзем да найбольш багатай краіны творчасьці Ядвігіна, да яго апавяданьняў — новэлаў, зьмешчаных у зборніках: „Бярозка" і „Васількі".

Новэлы гэтыя можна разьбіць на некалькі групаў:

1-ая група. Апавяданьні з сялянскага жыцьця, у якіх аўтар спачувае нядолі мужыка і трактуе справы паважна; да гэтай групы належаць: 1) *„Шчасьлівая"*, 2) *„Гаротная"*, 3) *„Зарабіў"* і 4) *„Зарабляюць"*.

II-ая група. Апавяданьні ў якіх нядоля і цемната беларускага селяніна ёсьць толькі матэрыялам для панскіх жартаў, у родзе г. з. „жыдоўскіх" ці „армянскіх" анэкдотаў; да гэтай группы належаць: 1) *„Вучоны бык"*, 2) *„З маленькім білецікам"*, 3) *Заморскі зьвер"*, 4) „П*азыка"*, 5) *„Важная фіга"* і 6) *„Суд"*;

III-цяя група. Апаведаньні аллегорычныя з палітычным зьместам. Аллегорычныя апаведаньні, пераважна з жыцьця жывёлаў, з палітычнай падкладкай; гэткімі ёсьць: 1) 1) „П*авук"*, 2) *„Вясельле"*. 3) *„Сабачча служба"*, 4) „П*ратэст"* і 5) *„Цырк"*,—найбольш моцная рэч у гэтай групе;

IV-ая група. Імпрэсыі: 1) *„Дуб-Дзядуля"*, 2) *„Чалавек"*, 3) *„Васількі"*, 4) *„Раны"* і 5) *„Бярозка"*;

V-ая група: Казкі і апаведаньні, пераважна з жыцьця зьвяроў і расьлін, ня раз з глыбокай мараляй, або сымбалічныя, ці аллегорычныя; гэткімі ёсьць: 1) *„Дачэсныя"*; 2) *„Што сказаў певень"*; 3) „Баба"; 4) *„Чортава ласка"*; 5) *„Нагарда"*; 6) *„Сіло"* 7) *„Рабы"*; 8) *„Сакатушка"*; 9) *„Хлеб"* і 10) „Гадунец";

VI-ая і апошняя група абыймае 3 рожныя творы: „П*ерапуд"*—абразок з студэнцкага жыцьця; *„Жывы нябошчык"*,—малюнак з вясковага жыцьця, ў якім ўзаемаадносіны паміж дваром і вёскай патрактаваны ідыльлічна, у духу Марцінкевіча; у канцы апаведаньне *„З бальнічнага жыцьця"*, у якім з вялікім талентам апісана сьмерць нейкага адзінотнага, шэрага, малага чалавека ў гарадзкой бальніцы.

Чытаючы гэты твор нявольна нагадуеш сабе сумны канец самога аўтара ў адным з віленскіх шпіталяў...

З усіх гэтых твораў відаць з аднаго боку не малую інтэлігэнтнасьць і літэратурны талент аўтара, з другога-ж — балючую духоўную разхістанасьць яго, дзякуючы каторай паасобныя творы Ядвігіна гэтак ідэолёгічна рожняцца паміж сабой, што нат трудна сабе ўявіць, што іх піша адзін чалавек. А аднак—мы бачым Ядвігіна як рэвалюцыйнага студэнта „народніка" і сьвядомага беларуса „нашаніўца", у другіх ізноў, прад намі—спольшчаны беларускі шляхціц, які сьмяшыць кумпанаў беларускімі анэкдотамі, у іншых-жа, бачым прад сабой тонкага імпрэсыяніста, ці вясёлага байкапіса. Зьявішча гэтае ёсьць вельмі характэрным для шляхоцкіх рамантыкаў, якім ёсьць А. Лявіцкі.

Аднак гэта духовая расхістанасьць не зьмяншае зусім тае вялікае ролі, якую грае Ядвігін ў беларускай літэратуры; стыль Ядвігіна—моцны, зьлітны; мова — чыстая, гучная; думка — глыбокая; настрой — тонкі, інтэлігэнтны; зьмест — захопліваючы...

У беларускай прозе ён, побач з Якубам Коласам, займае першае мейсца, перавышаючы аднак апошняга інтэлігэнтнасьцяй думкі і лёгкасьцю стылю.

Я. Сьветазар.

Спорт у беларусау



Футбольная др. жына пры беларускай гімназіі ў Дзьвінску. (Латвія).
Фат „Белар. Шк. у Латвіі".

зрабіць іншых грамадаўцаў, якія перакаланіся ў ашуканчай працы Грамады.

Партыйныя білеты N N 12051, 82964 далучаем да гэтага.

Язэп Беляўскі, Янка Гародка.

в. Драбавічы, Казлавецкае гм Слонімскага п

Паважаны Пане Старшыня!

Прашу надрукаваць у Вашай паважанай газэце наступнае:

Гэтым падаю да агульнага ведама, што выходжу з ліку сябраў гуртка Беларускай Сялянска Работніцкай Грамады Выходжу я дзеля таго, што Грамада зьяўляецца партыяй комуністычнай і не бароніць інтарэсаў беларускага сялянства.

Адначасова складаю заяву да „Прасьветы" з просьбай залічыць мяне ў сябры яе

Заклікаю іншых грамадаўцаў, для якіх стала яснай работа Грамады — зрабіць тое самае.

Янка Грынцук.

в. Барташы, Дварэцкае гм. Наваградзкага п.

Паважаны Пане Старшыня!

Прашу надрукаваць у „Беларускім Слове" наступнае:

Пераканаўшыся ў тым, што Б. С. Р. Грамада ёсьць сапраўды партыяй комуністычнай, толькі з беларускай ахварбоўкай, – я не маючы з комунізмам нічога супольнага – гэтым падаю да агульнага ведама, што выходжу з гэтае партыі.

Заклікаю іншых сябраў Грамады ў сваёй вёсцы Гуты, Слонімскага павету зрабіць тое самае

Толькі еднаючыся каля праўдзіва-нацыянальных арганізацый—як Беларуская Нацыянальная Рада, даб'емся — мы сваіх правоў.

Партыйны білет Грамады за N 47.117 мною зьнішчаны.

Банэдык Дзехцевіч.

в. Гуты, Слонімскага пав.

ПАВАЖАНЫ ПАНЕ СТАРШЫНЯ!

Пераканаўшыся ў тым, што Грамада ёсьць партыя комуністычная, а мы ня хочам мець з комунізмам нічога супольнага—дзеля гэтага выходзім са складу гуртка Грамады ў вёсцы *Бірулічах, Скідзельскае гміны, Горадзенскага павету.*

Нашыя партыйныя білеты памылкова (бо ня ведалі, што з імі рабіць) зьвернуты ў Цэнтральны Сэкрэтарыят Грамады.

Скварнук Васіль, Невчэнь Мікола.

в. Бірулічы, Скідэльскае гм. Горадзенскага п.

ПАВАЖАНЫ ПАНЕ СТАРШЫНЯ!

Мы ніжэй падпісаныя б. грамадаўцы ў *в. Саўлеўцы Жыдомлянскай гміны, Горадзенскага* павету, папаўшы да Грамады дзякуючы розным ашуканчым абецанкам платных агэнтаў Грамады, якія атрымлівалі грошы за кожнага завербованага сябра, баламуцілі нас дзеля асабістае карысьці -бо-ж іх абходзіць Беларусь, як нас пэрсыдзкі шах,—а ўсё рабілі так як ім прыказываў 3 інтэрнацыянал, працаваць на карысьць каторага мы ня хочам, здрадзілі нас і дзякуючы ім шмат нашых сялян трапіла да вастрогу — выходзім з Грамады.

Адначасна просім залічыць нас у лік сябраў гуртка Т-ва „Прасьвета", які істнуе ў нашай вёсцы.

Партыйныя білеты Грамады намі зьнішчаны

Няхай жыве Беларуская Нацыянальная Рада, якая бароніць нашых правоў!

Няхай жыве Беларускі Нацыянальны Рух!

Сташкевіч Ігнат, Сташкевіч Янка, Данысэвіч Янка, Саўка Максім, Арцыман Лявон, Салей Аляксей

в. Савалёўка, Жыдамлянскае гм. Горадзенскага пав

ПАВАЖАНЫ ПАНЕ СТАРШЫНЯ!

Гэтым даводзім да агульнага ведама ніжэйпаданае:

Дзякуючы салодкім абецанкам, а потым і пагрозам бальшавіцкае Грамады і паверыўшы, што грамадаўскія паслы сапраўды будуць бараніць нас сялян — мы запісываліся ў Граманду.

Пераканаўшыся ў тым, што грамадаўскія паслы здрадзілі Беларускі Народ — пра-

Тутэйшая хроніка.

Мэтадыстаўская работа Амэрыканская сэкта мэтадыстаў разьвівае апошнім часам ажыўленую дзейнасьць сярод беларускага грамадзянства; паміж іншым ап навалі мэтадысты школьны інтэрнат пры беларускай гімназіі ў Радашкавічах, на які кладуць не малыя грошы.

Выкарысталі мэтадысты роўным чынам вучыцельскія курсы, якія адбываліся пры памянёнай гімназіі ўлётку 1926 г., арганізуючы там свае лекцыі пад кіраўніцтвам пастара І. Вітта з Вільні.

Ад Новага Году гэтыя паны ўсіліваюць сваю прапаганду, пачынаючы выдаваць марненькі месячнік у беларускай мове, пад назвай „Дух і праўда". Рэдагуе гэты журнальчык Гальяш Леўчык, другарадны беларускі паэт, які запаўняе яго сваімі вершыкамі і артыкульчыкамі.

Аб усім гэтым піша „Слово".

Ад сабе дададзем, што мэтадыстаўскую акцыю на Беларусі запачаткаваў пэўны беларускі сэнатар. Прылажылі да яе руку і некаторыя грамадаўскія дзеячы, што цяпер сядзяць у турме.

Да справы мэтадыстаўскае работы мы яшчэ вернемся ў адным з наступных нумароў „Беларускага Слова".

Альяголічкі - саюзьнічкі.. Нядаўна мы зьмясьцілі заметку аб правакацыйнай штуцы б агэнта староства Цяўлоўскага ў супалцы з паслом Рагуляй, якія „этычнымі" спосабамі адабралі якіясь паперкі ў Баранавічах у п. Плаўсюка.

Нам камунікуюць з Баранавіцкага павету, што Рагуля творыць гурткі Інстытута Г. І. К. пры помачы свайго прыяцеля — гэт га-ж Цяўлоўскага. Пры ўсёй сымпатычнасьці ідэі Інстытуту і пры апалітычнасьці яго — думаем, што рукамі асобы, якая сваю „беларускую" грамадзкасьць выявіла хіба тым, што паступова аблазіла ўсё *польскія* арганізацыі, як Straż Kresowa, Rady Ludowe i Piast, якія як ведама мелі адну мэту — полёнізаваць Крэсы —рабіць што-небудзь беларускае, а тым больш культуру беларускую, гэта значыць прафанаваць гэтую культуру.

Не гаворым тут ужо аб даволі яснай ролі Цяўлоўскага на ўслугах мяйсцовага староства. .

Думаем, што новыя фактычныя кіраўнікі Інстытуту -- беларускія хадэкі, якія з боку этычнага ст яць нязьмерна вышэй сельсаюзьнікаў, зьвернуць увагу на прафанацыю Беларускай Культуры.

Палітычная гібкасьць. У Вільні выйшаў новы тыднёвік „Беларускі Дзень", пасьвячаны справам палітычна - гаспадарчым, пад рэдакцыяй аднаго з старэйшых адраджэнцаў Францішка Умястоўскага.

Між іншым аднэй з галоўных сваіх мэтаў „Беларускі Дзень" ставіць польска беларускае зьліжэньне.

Задачы, якія ставіць „Бел. Дзень" сымпатычныя. Але нажаль ад самага пачатку на шпальтах гэтага журналу забіраюць занадта ўтрытэтна голас асобы, якія ня толькі ад гэтага зьліжэньня гэтак-жа далёкі—як неба ад зямлі, але якія пры сваёй этычнай лоўкасьці, прыкладаюць руку да працы зусім процілежнай задачам „Б. Дня".

Мы маем на ўвазе Краўцова Макара, які ў „Маланцы" падпісваецца „Звончыкам" і сыстэматычна вылівае бруды на ўсе іншыя, апрача Грамады, беларускія арганізацыі

Новы беларускі журнал. Друкуецца і на днях выйдзе ў сьвет новы беларускі ілюстраваны літэратурна-мастацкі месячны журнал Выдае журнал Т-ва „Беларуская Хатка".

Прыпазьніўшаяся пацеха. Грамадаўская аднаднёўка „Наш водклік" з вялікім гукам падае дукумэнт ад 2 сакавіка аб ліквідацыі Сэкрэтарыяту Б. Н. Р. у Горадні. Інфармуем грамадаўскую рэптылію, што гэты дакумэнт перасланы ёй новым яе прыяцелям С. Валэйшам — трошкі ўстарэў і страціў вартасьць. Бо Рада мае два іншых дакумэнты, з пазьнейшымі датамі. Адзін ад 4 сакавіка, што сэкрэтарыят не ліквідуецца, падпісаны прэзыдыумам Сэкрэтарыяту і другі — 5 сакавіка, які дае доказы, што сэкрэтарыят быў правакацыйнай махінацыяй С. Валэйшы і К° ашуканы.

Запэўняем грамадаўскіх пісакаў і дзеячоў, што ані Грамадзе, ані розным цёмным яе кумпанам і саюзьнікам, ані скампраміта-

даліся за Юдавы чырвонцы, а нас толькі збаламуцілі, а гэта ўсё дзеля таго — каб атрымаць як найбольш даляраў — за якія пакупілялі сабе нярухомасьці.

Дзеля таго, што з комунізмам мы нічога супольнага ня маем і мець ня хочам — выходзім са складу сяброў гуртка Грамады ў в. Абухова, Жыдамлянскае гміны і прапануем тое самае зрабіць іншым грамадаўцам, якім дорага нашая Бацькаўшчына і наш Нацыянальны Рух! Няхай жыве Беларуская Нацыянальная Рада! Ганьба здраднікам Беларускага Народу, якія стараюцца тармазіць нацыянальную працу і падсовывалі нам пад маскай Беларусі—3 інтэрнацыянал!

Шчыра за працу!

Чырвоныя білеты здрадніцкай Грамады зьнішчаны намі

Аплевіч Мікола, Ваўчок Васіль, Новік Мікола, Аплевіч Павал, Печка *Ф., Кавальчук І*

в. Абухава, Жыдамлянскае гм. Горадзенскага пав.

ваць Б. Н. Раду, ані аслабіць яе ўплывы, якія што дзень павялічываюцца не ўдасца.

Найлепшым доказам няхай будуць друкаваныя вышэй адразу 22 заявы аб выхадзе з Грамады і просьбы аб прыняцьці ў „Прасьвету" і Б. Н. Раду

Пісьмо у рэдакцыю.

Паважаны Пане Рэдактар!

Краўцоў Макар, супрацоўнік безпартыйнай (?) газэты „Беларускі Дзень", ня могучы стрымаць сваей брахлівай натуры, ужо ў № 2 гэтае газэты ў артыкуле „Да братоў-пісьменьнікаў", зьнячэўку зачапіў мяне, закідаючы маяму перакладу—адрыўку з „Дзядоў" А Міцкевіча — безграматнасьць!"

На жаль! жоўчны Зоіл, кідае гэты закід з усім галаслоўна, чым рабіць немагчымым якуюбні было палеміку на гэтую тэму.

Спадзяючысь, што ён захоча падмацаваць сваю пустую зацемку нейкімі аб'ектыўнымі і фаховымі аргумэнтамі, адносна істнуючых у перакладзе зак'цаў адначасна прапаную яму перакласьці гэты кавалак самому і „блеснуць" талентам, калі ён гэтакі мае!

Добра такжа будзе ўспамянуць, што калі пэўны „Букіністы", які прыходзіцца (літэратурна) з радні нашаму Макару, лягнуў няпрыстойна ў нябошчыку „Грамадзкім Голасе" — вялікага песьняра беларускага У. Жылку за ягоны зборнік паэзыяў п. н. „На ростанї", дык вядомы крытык беларускі п. Суліма, пішучы аб гэтым самым, акрэсьліў гэтага „Букіністага", як „крытыкуючага Фідыя шаўца". „Sapienti sat!"

16 III 27 г.

Я. Сьветазар.

Жыцьце провінцыі.

Пратэст проці брахні грамадаўскай газэты.

(*Пісьмо з Баранавіч*).

Грамадаўская газэта „Наш Голас" зьмясьціла брахлівую заметку, пададзеную нібыта з Баранавіч. „Наш Голас" піша, што п. Паўлюкевіч прыехаў да Баранавіч, знайшоў двух нейкіх людзей, — якія кралі самавары і зрабіў канфэрэнцыю. Чытаючы гэтую заметку, кожны пастароньні чалавек можа падумаць, што гэта праўда. Аднак справа была зусім ня так.

Па першае: п. Паўлюкевіч прыех ў ня сам, а мы яго выклікалі.

Па другое: на канфэрэнцыю былі дапушчаны толькі два прадстаўнікі з Баранавіч, якія былі выбраны агульным сходам Т-ва „Прасьвета". Рэшту сябраў канфэрэнцыі (19 чалавек) складалі прадстаўнікі іншых паветаў Наваградчыны.

Сорам і ганьба грамадаўскай газэце.

Плаўсюк Васіль, Сівак Васіль, Хілько Петра, Слаўта Б., Жышко М., Мічкоўская Мар'я, Шулейка В.

Баранавічы. 5. III. 1927 г.

Адчыненьне бібліятэкі чытальні Т-ва Прасьвета у Баранавічах.

У Баранавічах 23 лютага адчынілася бібліятэка і чытальня Т-ва „Прасьвета". Памешканьне на вул. Шасовай № 158. Адчынены бібліятэка і чытальня ў сьвяточныя і рыначныя дні ад 10 да 3 гадз і ад 4 да 11 вечара.

Урад бібліятэкі зьвяртаецца з просьбай да беларускага Грамадзянства, ахвяровываць кнігі ў беларускай і іншых мовах.

Праца Слонімскага „выдзялу" павятовага.

Нібы са згоды „выдзялу павятовага" ў Слоніме — некаторыя гміны ў 1924 — 26 г. пачалі адбудову зьнішчаных вайной гмінных будынкаў. З гэтай мэтай была зроблена ссыпка збожжа. Сабралі на некалькі сот або і тысячаў, пудоў нібы дабравольнае ссыпкі ў кожнай гміне.

Цяпер ужо дзе работы скончыліся—дзе і не. Дзе рабочым заплочана, а дзе і дагэтуль людзі лазяць, каб з імі разьлічыліся.

Цікава—ці было належна скарыстана сабранае збожжа.

Усё гэтае рабілася за старастам Пшэцішэўскім і ягоным „dzielnym" інспэктарам.

Ці будзе цяпер дадзена справаздача аб сабраным збожжы — як яно расходавана.

М. Палачка

Слонімская хроніка.

17. II. у часе комуністычнай дэманстрацыі ў Слоніме, паміж іншымі, быў арыштаваны ўсім вядомы Фр. Серкевіч, з в. Селявічы. Цікава адзначыць, што пакуль істнаваў гурток Грамады ў Селявічах, гэты Серкевіч сядзеў у вёсцы, — як толькі гурток разьляцеўся — пайшоў ён на працу сярод работнікаў Слонімскіх лесапілак, — шукаючы новых ахвяраў.

Работнікі слонімскіх лесапілак павінны зьвярнуць увагу на гэтага чалавека, які за 50 грошаў гатоў прадаць і зарэзаць чалавека. Сьцеражыцеся! — Не аднаму — а 12 людзям вырыў ён яму ў 1925 г.

Работнікі жыдоўскіх Слонімскіх лесапілак вельмі наракаюць на інспэктара працы 66 вокруга ў Лідзе, да якога належыць Слонім, што надта мала інтэрэсуецца доляй работнікаў, якіх крыўдзяць жыды.

Жыды-купцы душаць проста работнікаў і нідзе німа ніякай помачы. Апошнім часам пастанавілі работнікі зьвярнуцца са скаргай да Міністра працы. Мо' гэта паможа нешта!..

Грамадзяне, якім дарма зусім прысылаюць з Вільні чырвоны „Narodny Zwon", пытаюцца:

Адкуль рэдакцыя „N. Zwon" дастала іхнія адрэсы?

Хто і колькі дае грошаў, бо „Nar. Zwon", ня толькі ніхто ня выпісывае, але і чытаць ніхто ня хоча.

Чырвоныя вашыя рукі ад крыві пралітай, — чырвоны і загалавак „N. Zwon" — ня трэба нам гэтай гнілі, хаця яна і друкуецца лацінкай на прыманку!

3. III. у Слоніме былі: міністар Складкоўскі і ваяв. з Наваградку Бэчковіч. Ўвесь Слонім быў на нагах...

Правадыры тэррорыстычнай сьмярдзючай памяці „Грамады", Сьцяпан Серкевіч і Янка Рэшкевіч з в. Селявічы, Слонімск. павету, дасталі адміністрац. парадкам па 14 дзён арышту за нелегальны сход у в. Селявічы. Цікава адзначыць, што на гэты сход прыйшлі толькі ведамыя ў той вёсцы хуліганы, угалоўны элемэнт і маладыя кандыдаты на... зладзеяў! Старшыя, усімі паважаныя сяляне не прыйшлі і не пойдуць ніколі туды, гдзе сідзяць „людзі", якія ў „Чэка" пралівалі нявінную кроў і добра грабілі ў Расеі,

3. III. 27 на шосе Слонім-Ружана былі раскінуты комуністычныя адозвы.

„Грамадаўцы" Езёрскай, Дзевяткаўскай і Міжэвіцкай гмінаў цяпер пускаюць чуткі, што каля 15. V. 27 г. пачнуць сваю „працу" ад таго, што абезаружаць паліцэйскія пастарункі і тагды будзе толькі іхняя „чырвоная міліцыя".

„Пан" Рагуля вельмі хваліць свой „Сял. Саюз" і кажа, што гэта ёсьць пяпер найболей паважная арганізацыя. Цікавая рэч! Ў Слонімшчыне німа ні *ваднага гуртка* гэтай псэдуа-паважнай партыі самахвалаў... Відаць з гэтага, што гэты „саюз" вельмі тут сяляне *паважаюць!*

Юрыдычныя парады.

Падп. Т. Шчэбету. *Запытаньне:*

1) Вёска нашая мае 7 дз. сенажаці, з якой карысталіся да 1879 г. усе гаспадары. Ад гэтага часу з сенажаці гэтай пачалі карыстацца толькі тыя з гаспадароў, якіх шнуры ўпіраліся ў гэтую сенажаць. Усе іншыя не карысталіся. Тымчасам падаткі плацяць усе гаспадары вёскі, а значыцца і тыя, якія фактычна з сенажаці не карыстаюцца. Ці можна адабраць гэтую сенажаць, г. зн. — каб маглі карыстацца ўсе гаспадары, або ці і як можна скінуць падатак з тых, якія з сенажаці не карыстаюцца?

Адказ: Адабраць і падзяліць, калі няма згоды тых, якія з сенажаці карыстаюць--фармальна нельга. Падаткі жа павінны быць скінуты. Зьвярніцеся з гэтым у гміну, выясьніце што і як і працце, каб падатак за сенажаць быў узложаны толькі па тых, якія з яе карыстаюцца, а з тых, хто не карыстаюцца—скінулі аплату падатку.

2) Ці можна змусіць суседа, каб не запушчаў пад лес свой сумежаны з маім, да гэтай пары йшоўшы так сама як і мой пад сеўбу,—шнур? А такжа колькі прастору ад мяжы можна адсякаць маладняк?

Адказ: Лес можна запусьціць, але пад варункам, што ад гэтага ня будзе мець страт сумежны ўласьнік. Гэткім чынам ўласьнік сумежнага з вашым шнура, калі запушчае па сваім шнуры лес — навінен будзе кампэнсаваць вас за страты. Таксама і маладняк па сумежым шнуры павінен быць адсечаны на такім прасторы, каб не зацеяў пасевы на суседнім шнуры. У першым і другім выпадку, калі няма дабровольнай згоды—зьвярніцеся да суда.

Паштовая скрынка.

М. Палачка — апошнюю карэспандэнцыю зьмяшчаем Раней прысланы матэрыял устарэў і нажаль быць зьмешчаным ня можа.

Янка Тарасаў—пішыце карэспандэнцыі карацей і стаўце дату, калі высылаеце. Пажадана больш фактаў.

Нерад Янка, —хаця Вы і пішаце:

Паважаны Пане Рэдактар
Я Вас прашу як аўтар,
Паперы Вы не пашкадуўце
І працу маю надрукуйце—

надрукаваць яе мы ня можам, бо мала Вы над ёй працавалі. Бо відаць, што Вы маглі-б напісаць лепей. Выдатнейшы беларускі паэт Максім Богданвіч гэтак сказаў аб пісаньні вершаў:

„Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш,
Абрабіць яго трэба з цярпеньнем..."

Радзім Вам папрацаваць над сабой.

Кіслы Янка — пакуль што вышлем Вам „Беларускае Слова".— праз тыдзень выйдзе журнал-мясячнік. Але рассылацца ён будзе толькі платным падпісчыкам.

Федаровіч Адам —пробны нумар „Беларускага Слова" вышлем. Даплатных пісьмаў ня прымаем

Якусюк Людвік, Карачун Янка, Шкулепа Васіль, Яцэвіч Ф. Марук Міхал, Барташэвіч Станіслаў, Ушкевіч Епіфан, Куц Мікола, Клаўсуць Аляксей—*пробныя нумары „Беларускага Слова" высылаем.*

Цыўнель Я, Забельскі Янка, Тумаш Лявон, Шыма0ўскі Аляксандар, Сапоцька Янка — газэту высылаем.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. Пасьпешная, Вільня Біскупья 12. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.